*М. І. КРУКОЎСКІ*

# ТЭАРЭТЫЧНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ: НАКОЛЬКІ ЯНА МОЖА БЫЦЬ ДАКЛАДНАЙ НАВУКАЙ?

*Сёння прызнана неабходнасць стварэння тэарэтычнай культуралогіі. Адзначыўшы гэта, аўтар паказвае, што дадзеная навука можа развівацца як дакладная і як навука даволі шырокага кола інтарэсаў з удзелам розных спецыялістаў.*

Тэарэтычная культуралогія і статус яе як самастойнай навукі, здаецца, не павінны сёння ўжо выклікаць ніякіх пярэчанняў. Нават у суседняй Расіі, дзе яшчэ зусім нядаўна ставілася пад сумненне законнасць існавання культуралогіі як самастойнай навукі ўвогуле, выйшла нядаўна з друку аб'ёмная кніга менавіта пад такім жа загалоўкам[1]. Размова можа ісці ўжо толькі ў плане далейшай канкрэтызацыі і развіцця тых прынцыпаў і ідэй, што закладваюцца ў аснову гэтай новай навукі і ў сэнс яе назвы. Сапраўды, калі нейкая навука пачынае называцца тэарэтычнай, то гэта значыць, што ў перспектыве яна прэтэндуе не толькі на строгую лагічнасць, але і на авалоданне пэўным матэматычным апаратам, як услед за фізікай і астраноміяй стала адбывацца і з іншымі навукамі, не толькі прыродазнаўчымі, але і гуманітарнымі, напрыклад у лінгвістыцы[2]. Тыя значныя ў свой час цяжкасці, якія доўгі час неакантыянцамі Рыкертам і Віндэльбандам лічыліся нават у прынцыпе невырашальнымі, сёння ўжо не здаюцца такімі абсалютнымі. Рыкерт і Віндэльбанд імкнуліся абапірацца, як вядома, на антынамічную філасофію Канта, у якога, як ён сам выказваўся, дзве рэчы заўсёды выклікалі здзіўленне: зорнае неба над ім і прынцып маральны ўнутры яго, і першае, будучы часткай прыроды, мела аб'ектыўны характар, а другое як сацыяльны факт – характар суб'ектыўны. Згодна гэтаму яны і занялі вядомую нам характэрную пазіцыю рашучага процістаяння паміж прыродазнаўчымі і гуманітарнымі навукамі і самі былі аднесены гісторыяй філасофіі да школы неакантыянцаў. На той жа пазіцыі стаяў і амаль што зусім ужо наш сучаснік К.Попер з яго энергічнай у Марксавым стылі крытыкай "убогасці гістарыцызму"[3]. Лічачы, дарэчы, услед за Герцэнам гісторыю ўсяго толькі "расхрыстанай імправізацыяй" і цалкам адмаўляючы з гэтай прычыны хаЛізм, ён аўтаматычна аказваецца ў шэрагах праціўнікаў і разгляданае тут праблемы, бо ўся матэматыка як інструмент дакладных навук якраз і ёсць не што іншае, як амаль што абсалютны халізм.

Сучасная філасофія ў адрозненне ад неакантыянства абапіраецца на дыялектычнае адзінства і цэласнасць як ідэальнага і матэрыяльнага, так і суб'ектыўнага і аб'ектыўнага аспектаў філасофскага мыслення, што па тых жа прычынах супрацьстаўляліся амаль што на ўсім працягу гісторыі філасофіі і асабліва ў нядаўнім марксізме-ленінізме (апошні, хоць і абвяўляў сябе дыялектычным, але дыялектычным па сапраўднай сваёй сутнасці не быў, бо рашуча адмаўляў якое б там ні было адзінства ідэальнага і матэрыяльнага). Адпаведна гэтаму і дэдуктыўнасць тэорыі, і індуктыўнасць практыкі ў ёй павінны зліватца ў цэласнай, адзінай метадалогіі, якая арганічна ўключае і вострую назіральнасць канкрэтнай эмпірыкі, і строга аксіяматычнае разуменне абстрактнай матэматыкі. Так што не толькі ў прыродазнаўстве, і перш за ўсё ў фізіцы, але і ў гуманітарных навуках (адпаведнікам фізікі ў гуманітарных навуках па сваёй аб'ёмнасці і абагуленасці якраз і магла б быць тэарэтычная культуралогія!) матэматыка павінна займаць законнае месца як арганічная частка агульнанавуковай метадалогіі. Менавіта як арганічная частка, а не як толькі нейкі знешні дапаможны сродак, што рабілася ў гуманістыцы ўжо з сярэдзіны XIX ст. у форме

[1] Гл.: *Теоретическая* культурология / под ред. К.Разлогова. – М., 2005. (Калектыўнае выданне тыпу зборніка пад моцным уплывам моднага сёння ў Расіі постмадэрнізму і, як заўсёды, без аніводнае спасылкі на Беларусь, дзе лагічныя асновы тэарэтычнай культуралогіі пачалі распрацоўвацца фактычна амаль на трыццаць гадоў раней (гл., напр., нашу манаграфію "Кибернетика и законы красоты". – Мн., 1977.)

[2] Цікава, што лінгвістыка вырвалася нават крыху наперад і, пачаўшы са структурнай лінгвістыкі Ф.Сасюра, стала ў сваю чаргу ўплываць на дакладнасць прыродазнаўства сваімі паняццямі структуры, сінхраніі і дыяхраніі, гэта значыць тым, што пазней увогуле лягло ў аснову агульнай тэорыі сістэм.

[3] Гл.: *Поппер, К.* Нищета историцизма / К.Поппер. – М., 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

featured

дакладнае месцазнаходжанне на небе планеты Нептун. Самае галоўнае тут – гэта тое, што кожны раз тэорыя, калі яна не поўнасцю адпавядае фактам, не адкідаецца цалкам, а толькі ўдакладняецца з тым, каб у сваю чаргу дапамагчы адкрыццю новых, яшчэ не адкрытых фактаў. Новыя факты абнаўляюць тэорыю, а новая тэорыя адшуквае новыя эмпірычныя факты. Так развіваецца кожная навука. Неразумна ні дагматычна на базе традыцыйнай чорна-белай двухзначнай логікі адстойваць тэорыю, якая пачала ўжо супярэчыць фактам, ні па-экстрэмісцку абмяжоўвацца стыхійным пошукам фактычнага матэрыялу ўсляпую, адкінуўшы цалкам стаўшую недакладнай тэорыю як зусім ужо непатрэбную мёртвую схему.

Гэтак жа павінна развівацца (і развіваецца!) навука культуралогія. Тут не месца падрабязна ўдавацца ў яе гісторыю[7], але, напрыклад, эпоха класічнай нямецкай філасофіі першай паловы XIX ст. з Гегелем ля яе вяршыні ў цэлым адпавядае перыяду панавання тэарэтычнага аспекту ў гісторыі як самой культуры, так і культуралогіі (тут абавязкова трэба ўлічваць пры гэтым і магчымасць узнікнення дадатковых складанасцей у сувязі з так называным раселаўскім парадоксам цырульніка[8]). У канцы ж XIX і пачатку XX ст. выразна пачынае праяўляцца перыяд панавання ў культуры толькі эмпірыкі, як, напрыклад, у працах вядомых культуролагаў Шпенглера, Тойнбі і Сарокіна. Сённяшні постмадэрнізм з яго крайнім ірацыяналізмам і агульнай барацьбой супраць так яму нялюбаму "логацэнтрызму" можна разглядаць ужо, гаворачы матэматычнай мовай, як ніжні функцыянальны экстрэмум працэсу развіцця, пасля чаго гэты працэс павінен пачаць ужо рухацца ўверх да новага пад'ёму тэорыі. Таму цалкам законным паваротам гісторыі ў бок чарговага нарастання фактару тэарэтычнасці з'яўляецца публікацыя ў Расіі цяпер такіх важных з тэарэтычнага пункту погляду даследаванняў культуры, як "Цивилизация (восхождение и слом)". – М., 2003, "Циклические ритмы в истории, культуре, искусстве". – М., 2004, а за імі ўжо і самой "Теоретической культурологии" пад рэд. К.Э.Разлогава.

Зрэшты, калі ўжо гаварыць аб пачатку распрацовак у галіне тэарэтычнай культуралогіі ў самым дакладным сэнсе гэтае назвы, то нельга не прызнаць, што такія распрацоўкі распачатыя былі менавіта ў нас, у Беларусі, ледзьве не сорак гадоў таму назад цыклам работ па тэарэтычнай эстэтыцы. Калі лічыць эстэтыку своеасаблівай тэорыяй мастацкай культуры, а так яно і ёсць, то ўжо першая з іх манаграфія пра логіку прыгажосці[9] была якраз і першым накідам такой работы. Яшчэ вялікі Гегель сцвярджаў, што як кожная навука ёсць прыкладная логіка, так і, наадварот, логіка заўсёды з'яўляецца тэорыяй кожнай навукі. А зусім ужо ў поўным сэнсе слова тэарэтычнай эстэтыкай, прызнанай такой і за мяжою, з'явілася наступная манаграфія пра кібернетыку і законы прыгажосці[10], дзе непасрэдна скарыстоўваўся і апарат матэматычнай логікі і прама заяўлялася, што апарат той "...даёт хорошую основу для постановки и решения проблемы культуры как некоей уже более широкой иерархической системы"[11]. Там жа былі падрабязна і шырока (амаль што на дваццаці старонках) абмеркаваны ў строга тэарэтычным, лагічным аспекце як сам гістарычны працэс цыклічнага сацыякультурнага развіцця ўвогуле, так і адносна больш канкрэтныя прычыны гэтай яго цыклічнасці і нават таго, што П.А.Сарокін у сваёй грандыёзнай "Сацыяльнай і культурнай дынаміцы" некалі называў суперцыкламі (сам Сарокін называў тыя цыклы і іх фазы флуктуацыямі, надаючы ім тым самым толькі верагоднасна выпадковы характар, а суперцыклы зусім пакідаў без тлумачэння). Але ўсё гэта было задушана панаваўшай тады атмасферай палітыка-ідэалагічнай нецярпімасці.

Сёння з прызнаннем неабходнасці стварэння тэарэтычнай культуралогіі і ўзнаўленнем распрацовак у гэтай галіне выразна бачыцца ўжо і неабходнасць рэзкага павелічэння

---

[7] Выдадзеная нядаўна ў Маскве вельмі цікавая і карысная "История культурологии" (пад рэд. праф. А.П.Агурцова) не асвятляе дастаткова менавіта гэты аспект гісторыі і самой культуралогіі.

[8] Лагічны парадокс, вядомы яшчэ з антычных часоў як парадокс ілгуна-крыцяніна і нанава сфармуляваны Бертранам Раселам як парадокс цырульніка, якому забараняецца галіць самога сябе менавіта таму, што ён можа рабіць гэта сам. Культуралогія, якая вывучае культуру, сама адносіцца да культуры і аказваецца змушанай такім чынам вывучаць і самую сябе, таксама рызыкуючы трапіць у становішча раселаўскага цырульніка.

[9] Гл.: *Крюковский, Н.И.* Логика красоты / Н.И.Крюковский. – Мн., 1965.

[10] Гл.: *Крюковский, Н.И.* Кибернетика и законы красоты / Н.И.Крюковский. – Мн., 1977.

[11] Там жа, с. 231.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лагічнай строгасці распрацовак не толькі з дапамогай пасіўна-ілюстрацыйнай статыстыкі, але і ў актыўна творчым логіка-матэматычным, а ў перспектыве і чыста матэматычным кірунку. Так, напрыклад, адна з найважнейшых праблем тэарэтычнай культуралогіі – праблема цыклічнасці сацыякультурнага развіцця (у нас, у Беларусі, гэтая цыклічнасць азначалася звычайна як сінусаідальнасць[12]) – у П.А.Сарокіна, як мы ўжо бачылі, трактавалася фактычна як запазычаная з тэорыі верагоднасцей і падмацаваная ілюстрацыйнай статыстыкай верагоднаснай флуктуацыі. А яшчэ раней тая цыклічнасць дык і зусім ужо трактавалася як толькі звычайная метафара, якою карыстаўся ў сваіх “Філасофскіх сшытках” нават У.І.Ленін, параўноўваючы наогул працэс развіцця са своеасаблівай спіраллю. Ад гэткай метафарычнай спіралевіднасці развіцця, дарэчы, не змог пазбавіцца нават сучасны даследчык інфармацыйнай цывілізацыі Р.Ф.Абдзееў[13].

З пункту гледжання сапраўды тэарэтычнага падыходу гэтую цыклічнасць трэба разглядаць менавіта ў двухмернай форме як пэўную перыядычную крывую, блізкую па сваёй геаметрычнай прыродзе да сінусоіды і ў матэматыцы азначаную больш агульным тэрмінам-паняццем “цыклоіды”. І менавіта разглядаць не як ілюстрацыю, а як рэальную логіка-матэматычную мадэль працэсу развіцця. Мадэль, якая нават у сваім вельмі спрошчаным варыянце пры больш-менш строгім лагічным аналізе можа даць нам вельмі шмат важнага і цікавага. Напрыклад, тое, што форму сінусоіды яна прымае толькі пры ўмове раўнамернасці руху гэтага працэсу. Калі ж гэты рух нераўнамерны, то крывая можа прыняць, напрыклад, такую форму, калі верхняя частка яе хваль (іх максімум, як гавораць матэматыкі) становіцца кароткай і як бы завостранай, а ніжняя, наадварот, больш працяглай і плаўнай. Аказваецца, дарэчы, што менавіта з гэтай з’явай мы сустракаемся і пры эмпірычным назіранні за працэсам развіцця, напрыклад у мастацкай культуры, дзе эпохі яе росквіту якраз і характарызуюцца такой хуткабежнасцю, у той час як перыяды станаўлення яе або ўпадку цягнуцца доўгімі стагоддзямі. Або калі азначаная сінусаідальная крывая мае ў якасці сваёй састаўляючай не прамую, а віток другой, яшчэ больш шырокай крывой, утвараючы тое, што Сарокін называў суперцыклам (на ёй мы спецыяльна спынімся ў свой час, бо яна апісвае ўжо не ход развіцця паасобнай культуры, ці фармацыі, як называў іх Маркс, а агульны працэс развіцця ўсяго чалавецтва ў цэлым).

Тут, нават нягледзячы на ўсё яшчэ крайне абстрактны і схематычны характар такога аналізу, перад намі адкрываюцца вельмі шырокія магчымасці для пошуку і разгляду іншых лагічных варыянтаў сітуацыі, для іх параўнаўчага аналізу, для пошуку новага адпаведнага ім эмпірычнага матэрыялу і г.д. Зразумела пры гэтым, што колькасць такіх магчымасцей адразу ж неверагодна ўзрастае, як толькі пачаць улічваць той факт, што грамадства і адпаведная яму культура як яго прадукт уяўляюць сабой не такую да прымітыўнасці спрошчаную, а складаную і перш за ўсё вельмі іерархізаваную сістэму. Але і гэтая сістэма можа таксама строга лагічна аналізавацца, хоць для таго спатрэбіцца ўжо дапамога прафесійнай матэматыкі. З гэтага, дарэчы, становіцца зразумелым, чаму для сапраўды навуковага развіцця тэарэтычнай культуралогіі патрэбна спачатку лагічная яе распрацоўка, і толькі пасля гэтага становіцца магчымай далейшая яе прафесійная матэматызацыя як ужо ў поўным сэнсе слова тэарэтычнай навукі.

Тое самае можа быць паказана і на іншым аналагічным прыкладзе. Нават у тым жа вельмі спрошчаным “сінусаідальным” варыянце працэсу сацыякультурнага развіцця выразна бачыцца магчымасць ужо і чыста матэматычнага яго трактавання з дапамогай такіх паняццяў вышэйшай матэматыкі, як вытворная функцыя з апарату дыферэнцыяльнага злічэння ці другая вытворная, з дапамогай якіх могуць быць апісаны і станы ўзыходнай ці сыходнай фаз працэсу развіцця, паскарэння або запавольвання такога развіцця. Агульнавядома, напрыклад, што пры ўзрастанні значэння функцыі, гэта значыць, калі дэманструючая яе крывая на хвалі нашай сінусоіды ўзнімаецца ўгору, знак яе першай вытворнай мае дадатнае значэнне, а пры памяншэнні гэтага значэння ўсё адбываецца наадварот і нават знак вытворнай становіцца адмоўным. Усё гэта адразу можа быць прыменена і да матэматычнага апісання і ацэнкі, напрыклад працэсу сацыякультурнага развіцця, калі згодна Гегелю і Сарокіну на фазе станаўлення дадзенай

[12] Гл.: *Крюковский, Н.И.* Логика красоты / Н.И.Крюковский. – Мн., 1965.
[13] Гл.: *Абдеев, Р.Ф.* Философия информационной цивилизации / Р.Ф.Абдеев. – М., 1994. – С. 103–109.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры духоўнае ў ёй пераважае над матэрыяльным і яна перажывае пад'ём, што і ацэньваецца дадатным знакам, а на фазе ўпадку ўсё адбываецца наадварот. Культура ж, як вядома, ёсць сістэмная сукупнасць менавіта духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, і момант ацэнкі адыгрывае ў ёй фундаментальна важную для чалавека ролю. А тады ўжо і на гэтым таксама яшчэ вельмі спрошчаным тэарэтычным узроўні становіцца выразна бачнай і непасрэдная практычная карыснасць такога падтрыманага аўтарытэтам матэматыкі аб'ектыўна-навуковага падыходу да нашых цяперашніх сацыякультурных праблем і іх ацэнкі, калі, напрыклад, многія людзі суб'ектыўна лічаць постмадэрнісцкую культуру чымсьці вельмі дадатным і прагрэсіўным толькі таму, што, маўляў, яна сучасная. Асабліва ж выразна назіраецца ўсё гэта ў галіне менавіта эстэтыкі як тэорыі мастацкай культуры, дзе падобная матэматызацыя вельмі добра дапамагае і дакладнаму вызначэнню такіх фундаментальна важных не толькі для тэарэтычных эстэтыкі і культуралогіі, але і для вельмі практычнай педагогікі паняццяў, як асноўныя эстэтычныя катэгорыі і катэгорыя стылю. Немагчыма ж цярпець ужо, калі постмадэрнізм аб'яўляе "омерзительными" і Баха, і Моцарта, або атрымліваць эстэтычную асалоду ад гумару ў стылі вядомага "Комеди Клаб".

Важную ролю адыгрывае падобны логіка-матэматычны падыход і да гістарычнага аспекту сацыякультурнай праблематыкі. Вельмі нялёгка бачыць, як аплёўваецца часам уласная гістарычная мінуласць на аснове аднаго толькі крайне палітызаванага, суб'ектыўна-эмацыянальнага ўспрымання яе храналогіі. Палітызаванасць як эмацыянальны суб'ектывізм заўсёды шкодзіць аб'ектыўнай навуцы[14]. І гісторыя культуры ўяўляе сабой рэальны працэс, што працякае ў адпаведнасці з аб'ектыўна рэальнымі законамі і выдатна апісваецца той жа логіка-матэматычнай методыкай. Гэта было добра вядома беларускай тэарэтычнай эстэтыцы ўжо з сярэдзіны сямідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, калі, напрыклад, зыходзячы з філасофіі вялікага Гегеля, рабіліся ўслед за польскім логікам Л.С.Рагоўскім[15] спробы і да гегелеўскай эстэтыкі стасаваць чатырохзначную логіку ў яе логіка-матэматычным варыянце[16]. Усе гэтыя метады і падыходы, будучы толькі варыянтамі канцэптуальна адной і той жа метадалогіі, выразна дэманструюць магчымыя выхады культуралогіі і на методыку дакладных навук з іх усемагутным апаратам прафесійнай матэматыкі. З гэтым, трэба думаць, пагодзіцца любы гуманітарнік, варта яму толькі пагартаць, напрыклад, хоць бы вядомую кнігу А.Кафмана пра тэорыю невыразных мностваў[17], даступную гуманітарніку толькі ў межах першай главы і фактычна разлічаную пераважна на матэматыкаў-прафесіяналаў. Усё гэта, думаецца, вельмі пераканаўча доказвае не толькі тое, што тэарэтычная культуралогія магчымая як дакладная навука,[18] але і што яна, як культуралогія, будучы навукай вельмі шырокага абсягу інтарэсаў, павінна распрацоўвацца калектыўна з прыцягненнем і адпаведна самага шырокага кола спецыялістаў, уключаючы і прафесійных матэматыкаў.

---

[14] Суадносіны суб'ектыўнасці і аб'ектыўнасці ў сацыякультурным аспекце таксама могуць быць строга лагічна апісаны з дапамогай ужо вядомай нам логіка-матэматычнай матрыцы (гл.: *Крюковский, Н.И.* Кибернетика и законы красоты / Н.И.Крюковский. – Мн., 1977. – С. 224–225).

[15] Гл.: *Rogowski, L.S.* Sens logiczny hegelowskiej koncepcji sprzecznosci zmiany i ruchu / L.S.Rogowski // Studia filozoficzne. – 1961. – № 6 (27).

[16] Гл.: *Крюковский, Н.И.* Основные эстетические категории (опыт систематизации) / Н.И.Крюковский. – Мн., 1974. – С. 265–266; *Крюковский, Н.И.* Кибернетика и законы красоты / Н.И.Крюковский. – Мн., 1977. – С. 201 и др.

[17] *Кофман, А.* Введение в теорию нечетких множеств / А.Кофман. – М., 1982.

[18] Дакладная ў тым сэнсе слова, што яна карыстаецца строгай логіка-матэматычнай метадалогіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ